# Старшыні Совета Народных Камісараў БССР
# тав. Панамарэнка П. К.

# Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевічу Н. Я.

# Сакратару ЦК КП(б) Беларусі
# тав. Кісялёву Н. В.

Віншую Вас, рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыю Беларускай Рэспублікі ў дзень Усенароднага Свята—гадавіны з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Беларуская рэспубліка адзначае гэту знамянальную дату ў абстаноўцы вялікага торжаства перамогі над фашысцкай Германіяй. У годы вялікай Айчыннай вайны беларускі народ унёс каштоўны ўклад у агульную справу барацьбы за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, праявіў доблесць і мужнасць.

За прайшоўшы год працоўныя Беларусі, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам Усесаюзнай Комуністычнай Партыі большэвікоў, дабіліся поспехаў у справе аднаўлення гаспадаркі, разбуранай нямецкімі акупантамі.

Жадаю працоўным Беларускай ССР, натхнёным перамогай Совецкага Саюза над гітлераўскай Германіяй, у перыяд мірнага развіцця, разам з усімі народамі Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна множыць свае дасягненні ў аднаўленні гаспадаркі на карысць беларускага народа.

**Маршал Совецкага Саюза С. БУДЗЁННЫ.**

2 ліпеня 1945 года.

г. Масква.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ